ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 3 2007
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

УДК 946.7

*С. Я. НОВІКАЎ*

# ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ 1941–1945 гг. У КАНТЭКСЦЕ ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЙ КАМПАРАТЫВІСТЫКІ

*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 06.02.2007)*

Важнейшым паказчыкам узроўню развіцця любой навукі, у тым ліку гістарычнай, з'яўляецца ступень выкарыстання адэкватных метадаў даследавання. Інтэграцыйныя тэндэнцыі, незваротнасць якіх вызначаецца ўмовамі цяперашняга пастаянна ўзрастаючага навуковага прагрэсу, ствараюць унікальныя ўмовы для выяўлення сапраўднага месца беларускай ваенна-гістарычнай навукі ў кантэксце нацыянальных гістарыяграфій іншых краін-удзельніц другой сусветнай вайны. Але ж у гістарыяграфіі, як айчыннай, так і замежнай (у нашым выпадку германскай. – *С. Н.*), не толькі не вырашана, але нават фактычна не пастаўлена пытанне аб даследаванні падзей вайны на аснове кампаратыўнага аналізу навукова правераных гістарыяграфічных фактаў, у тым ліку і супрацьлеглага характару. У якой ступені беларуская ваенна-гістарычныя навука стала карыснай для германскіх даследчыкаў і наадварот, наколькі германская гістарыяграфія з'яўляецца асновай для паглыблення ведаў па маладаследаваных, супрацьлеглых, іншы раз узаемавыключальных пытаннях гісторыі Беларусі ў гады другой сусветнай вайны? Абгрунтаваны адказ на гэта пытанне можа служыць доказам неабходнасці пошуку новага даследчыцкага напрамку.

Мэта дадзенай працы – замацаванне ў беларускай ваенна-гістарычнай навуцы арыгінальнага напрамку па даследаванні не столькі ваеннай гісторыі Беларусі, колькі айчыннай гісторыі вайны: яе канцэптуальнай асновай павінна быць разам з вылучэннем заканамернасцей, уласцівых айчыннай гістарыяграфіі гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і выяўленне асаблівасцей эвалюцыі беларускай і германскай гістарыяграфіі з вызначэннем найбольш значных уласцівасцей развіцця айчынных і замежных даследаванняў па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце другой сусветнай вайны.

Ключом навуковага пошуку для дасягнення пастаўленай мэты нам бачыцца *гістарыяграфічная кампаратывістыка* – параўнальна-гістарычны метад па даследаванні гістарыяграфіі гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце гістарыяграфічных фактаў, уведзеных і замацаваных германскай гістарыяграфіяй гісторыі другой сусветнай вайны. У любым гістарычным даследаванні параўнанне традыцыйна выступае ў якасці універсальнага метаду навуковага пазнання. Важнасць звароту да параўнальна-гістарычнага метаду, ці кампаратыўнага метаду ў гістарыяграфічным даследаванні, абгрунтавана тым фактам, што да цяперашняга часу гэты метад застаецца нераспрацаваным у айчыннай гістарычнай навуцы. Канцэнтруючы ўвагу не толькі на параўнальна-гістарычным аналізе, колькі на кампаратыўным сінтэзе, мы зыходзім з гіпотэзы: *у сучаснай гістарычнай навуцы на першы план вылучаецца задача па атрыманні новых гістарычных ведаў шляхам правядзення параўнальна-гістарычнага даследавання айчыннай і замежнай гістарыяграфіі з мэтай фарміравання с і с т э м ы навуковых ведаў аб гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце другой сусветнай вайны.*

Імкненне сучасных даследчыкаў да атрымання новых навуковых ведаў аб беларускай ваеннай гісторыі патрабуе выкарыстання розных падыходаў. У дадзеным выпадку трэба зыходзіць з факта магчымага існавання самастойных як параўнальна-гістарычнага, так і параўнальна-

гістарыяграфічнага метадаў: асновай для абодвух падыходаў з'яўляюцца навуковыя факты. Аднак гісторыка цікавяць толькі гістарычныя факты, тады як гістарыёграф аддае перавагу тым з іх, якія прайшлі адпаведную навуковую праверку і знайшлі замацаванне ў навуковых даследаваннях. З гэтага пункту погляду асаблівую важнасць параўнальна-гістарыяграфічнаму метаду надае той факт, што кампаратыўнае даследаванне беларускай і германскай гістарыяграфіі, у аснове якой ляжалі адны і тыя ж ваенныя падзеі, можа служыць мэтам не толькі выяўлення гістарычнай рэчаіснасці, але і мэтам лепшага разумення прычын разнастайнасці, супрацьлегласці і ўзаемавыключальнасці адных і тых жа агульных гістарычных падзей.

Зазначым, што правядзенне параўнальна-гістарычнага даследавання асноўных прычын эвалюцыі беларускай і германскай гістарыяграфіі стаіць у якасці актуальнай задачы для сучаснай гістарычнай навукі настолькі, наколькі такі падыход акрэслівае сабой стратэгію па цэласным даследаванні гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны выключна ў кантэксце другой сусветнай вайны. Практычным вынікам выкарыстання гістарыяграфічнай кампаратывістыкі можа стаць замена апісальнага метаду, пануючага ў айчыннай ваеннай гістарыяграфіі, метадам кампаратыўнага аналізу айчыннай і замежнай гістарыяграфіі – гэта дазволіць наблізіцца да сістэмы ведаў аб ваеннай гісторыі Беларусі, гісторыі вайны, гісторыі ваеннай паўсядзённасці, гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі Беларусі перыяду другой сусветнай вайны.

Нягледзячы на наяўнасць у нацыянальнай гістарыяграфіі розных метадалагічных падыходаў да навуковага аналізу падзей «гісторыі другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны» [1, с. 3], беларускія даследчыкі трывала прытрымліваюцца традыцыйнай навуковай парадыгмы гісторыі Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. [2–5]. Ваеннай гісторыі Беларусі прысвечаны сотні навуковых прац. Але сярод іх – адзінкі, у якіх «праблемы ваеннай гісторыі Беларусі» падлягаюць комплекснаму гістарыяграфічнаму даследаванню [6, с. 4; 7]. Агляд цяперашняга стану айчыннай гістарыяграфіі, прысвечанай даследаванню розных праблем гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, пераканаўча сведчыць, што практычна выключэннем з'яўляюцца працы, у якіх праводзіцца аналіз замежнай гістарыяграфіі [8–11]. І гэта пры тым, што беларуская акадэмічная навука неаднаразова адзначала факт адсутнасці такіх даследаванняў у сучаснай нацыянальнай гістарыяграфіі [11, с. 18; 13, с. 112]. На «круглым стале», праведзеным аддзелам ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі па праблемах стану айчыннай гістарыяграфіі і аб перспектывах даследавання праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны А. М. Літвін выказаў надзвычай важную думку аб тым, што ў сучаснай беларускай ваенна-гістарычнай навуцы «асобнай тэмай павінны быць вывучэнне напрацовак замежнай гістарыяграфіі па пытаннях ваеннай гісторыі Беларусі: англамоўнай, германскай, французскай, расійскай, польскай і інш.» [14, с. 15].

У гэтай сувязі важна мець на ўвазе, што беларуская савецкая гістарыяграфія па ідэалагічных прычынах абыходзіла пытанні аб'ектыўнага даследавання замежнай увогуле і германскай гістарыяграфіі ў прыватнасці [15], ставячы ў цэнтр навуковых прац крытыку «заходнегерманскай буржуазнай гістарыяграфіі» [16] і «выкрываючы фальсіфікацыі» гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны [17–20].

У цяперашняй айчыннай гістарыяграфіі практычна ўстаяўся падыход, калі пры правядзенні нават фундаментальных даследаванняў беларускія гісторыкі пакідаюць без аналізу сусветна вядомыя распрацоўкі замежнай гістарыяграфіі ўвогуле і германскай гістарыяграфіі ў прыватнасці па гісторыі вайны, таго, што ў апошні час адметна акрэслілася ў самастойны навуковы напрамак – германскую ваенную беларусістыку. Выкарыстанне апошняй асабліва важна з той прычыны, што германская ваенная беларусістыка раскрывае самыя розныя праблемы гісторыі Беларусі 1941–1944 гг. [22–31]. Пры тым, як асобныя нямецкія даследчыкі, так і фундаментальныя даследаванні ў сучаснай германскай ваенна-гістарычнай навуцы не абмінаюць увагай важнейшыя працы, створаныя беларускай гістарыяграфіяй за пасляваенны перыяд гісторыі [21; 31].

Зварот да гістарыяграфічнай кампаратывістыкі як самастойнага метаду даследаванняў і самастойнага навуковага напрамку гістарычнай навукі прадыктаваны відавочнымі фактамі.

Па-першае, праўдзівую гісторыю вайны, якая аб'ектыўна з'яўлялася вынікам двухбаковай дзейнасці, нельга аднавіць без паказу ваенных падзей з улікам навуковых распрацовак кожнага

дзеючых бакоў. Раней апублікаваныя беларускай гістарыяграфіяй працы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прадстаўлялі ў асноўным аднабаковы паказ ваеннага мінулага беларускага народа, пакідаючы шматлікія трагічныя старонкі айчыннай гісторыі без увагі даследчыкаў. Да цяперашняга часу не ставілася задач па правядзенні комплекснага даследавання гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на аснове аналізу адначасова і беларускай, і германскай гістарыяграфіі.

Па-другое, актуальнасць такога даследавання абумоўлена навуковай неабходнасцю выяўлення асноўных этапаў і тэндэнцый развіцця, паказу вынікаў канцэптуалізацыі праблем ваеннай гісторыі ў германскай гістарыяграфіі. Выяўленне агульных рыс, характэрных для замежнай ваенна-гістарычнай навукі, раскрывае прынцыпова важныя падыходы нямецкіх гісторыкаў да трактоўкі кардынальных праблем гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце падзей другой сусветнай вайны.

Па-трэцяе, вывучэнне германскай гістарыяграфіі дазваляе глыбей спасцігнуць ваенную гісторыю Беларусі. За пасляваенны перыяд Германія пераўтварылася ў адзін з галоўных навуковых цэнтраў па даследаванні гісторыі другой сусветнай вайны: германская ваенна-гістарычная навука лічыцца сярод заходніх нацыянальных гістарыяграфій адной з самых буйных [21]. Нямецкімі гісторыкамі ўнесены значны ўклад у грунтоўнае вывучэнне ваеннай гісторыі [25–27; 29; 30], гісторыі вайны [23; 24; 28; 31], гісторыі ваеннай паўсядзённасці ў Беларусі [22–24; 28; 31].

Па-чацвёртае, трываласць навуковых распрацовак сучаснай германскай гістарыяграфіі вызначае той факт, што свае даследаванні нямецкія гісторыкі вядуць з выкарыстаннем новых навуковых адкрыццяў, на аснове максімальна поўнай базы дакументаў, а таксама пры абавязковым уліку навуковых здабыткаў сучаснай сусветнай гістарыяграфіі вайны.

Па-пятае, у апошні час у сувязі з сацыяльна-палітычнымі зменамі ў маладых айчынных даследчыкаў назіраецца тэндэнцыя да некрытычнага запазычання падыходаў заходняй гістарыяграфіі і спробай скажэння гісторыі вайны. Задача сучаснай беларускай гістарычнай навукі – «напісанне аб'ектыўнай гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» [12, с. 18], адказ беларускіх гісторыкаў ад тэндэнцыйнасці пры навуковым аналізе германскай гістарыяграфіі ваеннай гісторыі Беларусі.

Параўнальна-гістарычны аналіз германскай і беларускай гістарыяграфіі, на наш погляд, дазваляе выявіць і тое пазітыўнае, што было створана ў навуковых працах нямецкіх гісторыкаў, а таксама адкінуць непатрэбнае, перашкаджаючае атрыманню сапраўдных навуковых ведаў. Патрэба ў выкарыстанні кампаратыўнага метаду на сёння ўзмацняецца тым, што ў Беларусі адбываюцца істотныя грамадскія працэсы, у якіх важнае месца надаецца гістарычнай свядомасці беларускага народа, асабліва моладзі ў кантэксце захавання беларускай нацыяй памяці аб гераічных і трагічных старонках Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. [32–35].

Апошнім часам у традыцыйнай айчыннай ваеннай гістарыяграфіі стала відавочнай наступная заканамернасць: новыя навуковыя веды аб вайне назапашваюцца ў асноўным у выніку правядзення даследаванняў айчыннымі аўтарамі. Гэта стварыла сітуацыю, у якой у выніку плённай працы беларускіх гісторыкаў праведзены шэраг комплексных даследаванняў па гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аднак у гэтых працах практычна не адводзіцца месца для гістарыяграфічнага а н а л і з у (не блытаць з гістарыяграфічным аглядам. – *С. Н.*) замежнай навуковай літаратуры, якая часам толькі ў дзяжурным парадку згадваецца ў спісе літаратуры і крыніц. Па сутнасці, беларускія гісторыкі ці то наўмысна абмяжоўваюць свае даследаванні рамкамі айчыннай гістарыяграфіі, ці штучна адасабляюць сябе ад навуковай дыскусіі з замежнымі гісторыкамі, альбо такім шляхам выкрываюць «буржуазных фальсіфікатараў» гісторыі вайны. У гэтай сувязі задачай ваенна-гістарычнай навукі часам з'яўляўся не столькі пошук праўдзівых ведаў у дачыненні да надзвычай складанай гістарычнай праблематыкі, колькі ідэалагічна заангажаванае непрыняцце вынікаў замежных даследаванняў асабліва па супярэчлівых праблемах вайны.

Прапанаваны прафесійнаму чытачу навуковы падыход не прэтэндуе на бездакорнасць, але з'яўляецца першай спробай у навуковай пастаноўцы праблемы і імкненнем да комплекснага даследавання ваеннай гісторыі Беларусі ў кантэксце гістарыяграфічнай кампаратывістыкі.

Зазначым, што ў дадзеным падыходзе цэнтральным пунктам адбудовы навуковай канцэпцыі айчыннай ваеннай гісторыі лічацца выключна гістарыяграфічныя крыніцы, навуковы аналіз якіх з'яўляецца надзейнай асновай даследавання гісторыі беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг.

Звернемся ў якасці прыкладу да такой праблемы, як эканамічная палітыка германскіх акупантаў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Практычна да выхаду ў свет новага фундаментальнага даследавання «Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945» (Минск: БЕЛТА, 2005. – 544 с.) у айчыннай гістарыяграфіі была замацавана навуковая тэза аб «зрыве эканамічных мерапрыемстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў» на тэрыторыі Беларусі [36, с. 356]. Такая высноўа не знаходзіла дакументальнага пацвярджэння ў працах нямецкіх даследчыкаў, у першую чаргу берлінскага гісторыка Х. Герлаха, які ў даследаванні «Скалькуляваныя забойствы: германская эканамічная палітыка і палітыка вынішчэння ў Беларусі 1941–1944» (Гамбург, 2000. – 1232 с.) паказваў сапраўдны маштаб нацысцкай эканамічнай палітыкі ў Беларусі ў 1941–1944 гг.

У беларускай савецкай гістарыяграфіі ў дачыненні да шэрагу розных аспектаў германскай эканамічнай палітыкі ў Беларусі зацвердзіліся розныя, у тым ліку і ўзаемавыключальныя пазіцыі. Так, з канца 1960-х гадоў гісторыкамі ўводзіцца тэза аб тым, што ва ўмовах нямецкай акупацыі «на гітлераўцаў працавала асноўная маса сялянства Беларусі» [37, с. 297], аднак ні ў адным выданні не згадваліся статыстычныя даныя, якія б пераконвалі беларускага чытача ў тым, што гэты былі мільёны мясцовых жыхароў [38, с. 216], якія ў складаных умовах першых месяцаў вайны засталіся на акупаванай тэрыторыі Беларусі і вымушаны былі прымусова працаваць на германскіх захопнікаў як на беларускай зямлі, так і за яе межамі [39]. Зварот да новых нямецкіх даследаванняў дае падставу для поўнага адказу на гэта надзвычай складанае і супярэчлівае пытанне.

Пры даследаванні стану прамысловай вытворчасці ў гістарычных працах сцвярджалася аб яе поўным заняпадзе, а ў якасці доказу аўтарамі прыводзіліся статыстычныя матэрыялы апошняга мірнага 1940 г. Кажучы пра перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі ў Мінску, лічбы падаваліся так, каб пры гэтым пацвярджаўся факт «зрыву эканамічных мерапрыемстваў у акупаваным горадзе». Паводле акадэмічнай працы, падрыхтаванай да 50-гадовага юбілею сацыялістычнай рэвалюцыі, атрымлівалася: «у кастрычніку 1941 г. у Мінску працавала толькі 39 прамысловых прадпрыемстваў, на якіх былі заняты 3378 чалавек [...], і да кастрычніка 1942 г. у падпарадкаванні Мінскага гарадскога камісарыята засталося толькі 10 прадпрыемстваў» [37, с. 293].

Савецкія даследчыкі ваеннай гісторыі па розных прычынах, у тым ліку існуючых абмежаванняў у дачыненні да выкарыстання архіўных дакументаў, не раскрывалі поўнай карціны вытворчых адносін у акупаваным Мінску. Як вынікае з нямецкіх даследаванняў, на пачатак вясны 1943 г. у горадзе Мінску дзейнічалі 150 буйных прадпрыемстваў і 180 розных вайсковых і грамадзянскіх устаноў, на якіх былі прыцягнуты да працы 41 тыс. чалавек [24, s. 394]. Між тым нашы ўласныя пошукі, праведзеныя на аснове параўнаўчага аналізу беларускай і германскай гістарыяграфіі, сведчаць аб неабходнасці ўнясення ўдакладненняў у дачыненні да агульнай лічбы дзеючых прадпрыемстваў, прыведзеных у даследаванні Х. Герлаха. Па нашых падліках, зробленых з выкарыстаннем наяўных гістарыяграфічных крыніц, вясной 1943 г. у горадзе Мінску працавала 140 прадпрыемстваў [40, с. 128], на якіх былі заняты 35 тыс. чалавек (з 56 тыс. усіх узятых на картачны ўлік з 105 тыс. жыхароў акупаванага Мінску. – *С. Н.*), а таксама 8500 яўрэяў і 3190 ваеннапалонных [38, с. 154].

Такім чынам, прыведзены навуковы аналіз айчынных і замежных гістарыяграфічных крыніц адкрывае значныя магчымасці для аб'ектыўнага даследавання розных пытанняў гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Тым не менш, мова гістарыяграфічнай кампаратывістыкі пакуль не стала залатым правілам нацыянальнай ваенна-гістарычнай навукі, выкарыстанне якога неабходна па шматлікіх пытаннях ваеннай гісторыі Беларусі, паколькі далейшае вывучэнне ваенна-гістарычнай праблематыкі можа весціся на аснове выключна ўзважанага вывучэння распрацовак розных даследчыцкіх школ, традыцый і метадалагічных падыходаў. Інакш кажучы, таго, што ўтварае падмурак арыгінальнага напрамку для даследаванняў ваеннай праблематыкі ў святле кампаратыўнага аналізу айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Напрамак, у якім бы зблі-

жаліся погляды беларускіх і нямецкіх гісторыкаў у дачыненні да падзей адзінай ваеннай гісторыі ў гады германскай акупацыі Беларусі.

Не прэтэндуючы на выключнае вырашэнне пастаўленай даследчыцкай праблемы па ўвядзенні метаду гістарыяграфічнага кампаратывізму ў дачыненні да айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, аўтар канцэнтруе сваю ўвагу на важнасці замацавання ў навуковай практыцы гэтага стратэгічнага напрамку з мэтай стварэння падстаў для комплекснага вывучэння ваеннай гісторыі, асабліва гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце другой сусветнай вайны.

Нам уяўляецца, што больш адэкватнае разуменне *феномена* вайны магчыма на шляху выкарыстання базісных палажэнняў гістарыяграфічнай кампаратывістыкі. Зыходзячы з гэтай тэзы, мы маем справу з такой сістэмай навуковага светаўспрымання, якая б будавалася на абавязковым уліку розных поглядаў і пошуку іх адпаведных навуковых ацэнак у сістэме гістарыяграфічных каардынат. У гэтым выпадку мы прытрымліваемся класічнай думкі, што гісторыя можа лічыцца навукай у той меры, у якой яна вытлумачвае свет, але вытлумачыць яго магчыма толькі дзякуючы *параўнанню.* Як вядома, перад неабходнасцю выкарыстання метаду кампаратывізму сусветная гістарычная навука стала яшчэ ў пачатку XX стагоддзя. Французскі гісторык Марыс Эмар ў сваёй працы «Гісторыя і кампаратывізм» зазначае, што выхад на новы ўзровень гістарычная навука звязвае з «інтэграцыяй усёй складанасці і супярэчлівасці рэальнасці, а не ігнаруючы іх ці выносячы за дужкі» [41, с. 81]. Гістарычная навука ад выкарыстання такога падыходу толькі выйграе.

Аб месцы кампаратыўнага аналізу ў вырашэнні задач па навуковым пазнанні буйнамаштабных гістарычных з'яў (Вялікая Айчынная вайна дапасуе да іх у першую чаргу) пішуць і беларускія аўтары вучэбнага дапаможніка «Метадалагічныя праблемы гісторыі», адзначаючы пры гэтым той факт, што наяўнасць любых падыходаў, у тым ліку супярэчлівых, дае гісторыку магчымасць разглядаць любую падзею не па прынцыпу «ўзаемавыключэння», а з пункту погляду прынцыпу «дадатнасці», выяўляючы пры гэтым станоўчыя моманты ў кожным з існуючых падыходаў [42, с. 57]. Мы падзяляем гэту тэзу і падкрэсліваем, што якраз у рамках такога падыходу гістарычны працэс можа быць разгледжаны ва ўсёй шматлікасці яго характарыстык, варыянтнасці гістарычнага існавання, накіраванасці на плюралістычны дыялог культур і абгрунтаванасці перспектыў цывілізацыйнага развіцця.

Апошняе не пярэчыць прынцыпу кампаратывізму, паколькі ў класіфікацыйным рэестры навуковых тэорый вызначальнай з'яўляецца тэорыя сінтэзу, на аснове якой магчыма дасягненне не зыходнага, а *вышэйшага* ўзроўню тэарэтычнага пазнання. Кампаратыўны падыход якраз і дазваляе суаднесці навуковыя веды аб шматлікіх гістарычных з'явах, падзеях і фактах з гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны з аналагічнымі навуковымі ведамі, адлюстраванымі ў замежных даследаваннях па гісторыі другой сусветнай вайны. Мэтай у гэтым выпадку з'яўляецца абагульненне выяўленых навуковых звестак, іх характарыстыка і ўключэнне атрыманых ідэй у *інтэграваную* навуковую сістэму з яе шматграннай праблематыкай.

Эфектыўнасць кампаратыўных даследаванняў у гістарычнай навуцы на цяперашні час абумоўлена тым відавочным фактам, што ўзмацненне інтэграцыйных працэсаў патрабуе паставіць у парадак дня новы ўзровень ведаў, здабытых на аснове не столькі класічных, колькі нетрадыцыйных тэарэтыка-метадалагічных падыходаў, у тым ліку – гістарыяграфічнай кампаратывістыкі. Гэта непазбежна вымагае выхаду за рамкі нацыянальнай гісторыі, значыць, патрабуе звароту да ведаў па ваеннай гісторыі і гісторыі вайны, назапашаных замежнай гістарыяграфіяй, прымушае шукаць абгрунтаванні на карысць неабходнасці правядзення менавіта параўнаўчага гістарыяграфічнага даследавання.

У гэтым пытанні мы цалкам згодны з высновай расійскага спецыяліста ў галіне гуманітарнага пазнання М. Ф. Румянцавай, якая ў працы «Тэорыя гісторыі» зазначае: «увогуле ўвага да метаду павінна ўзмацняцца па меры ўскладнення задач, якія стаяць перад навукай» [43, с. 54]. Надзвычайная актуальнасць такой тэзы вынікае з яе высновы аб тым, што ў сучаснай тэорыі пазнання склалася парадаксальная сітуацыя: выклікаўшы інтарэс да параўнальна-гістарычных даследаванняў, сацыяльная навука на працягу ўсяго мінулага стагоддзя так і не выпрацавала адэкватнага метаду іх рэалізацыі. У такой сітуацыі, як зазначае расійскі гісторык, адным з асноўных спосабаў асэнсавання матэрыялу нацыянальнай гісторыі ў агульнатэарэтычным гістарычным кантэксце

з'яўляецца параўнальна-гістарычнае даследаванне [43, с. 57]. Працягваючы гэту думку, можна адзначыць: гістарыяграфічная кампаратывістыка ў сучаснай навуцы можа разглядацца ключавым метадам для аналізу матэрыялаў па гісторыі айчыннай і замежнай гістарычнай навукі, у якой даследуецца ваенная праблематыка.

Гістарыяграфічная кампаратывістыка як даследчыцкі метад павінна сваёй навуковай мовай вытлумачваць гістарыяграфічныя факты і выяўляць гістарыяграфічныя заканамернасці іх узнікнення і развіцця. Так, аналіз усяго комплексу айчынных і замежных гістарыяграфічных крыніц, адпаведных тэме і задачам даследавання гісторыі гістарычных ідэй, і дае падставы для высновы: навуковая значнасць такога даследавання вызначаецца распрацоўкай інтэгратыўнай сістэмы ведаў, новай гістарыяграфічнай базай для ўдакладнення тэарэтычных уяўленняў аб гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў кантэксце другой сусветнай вайны.

Кампаратыўны аналіз айчыннай і замежнай гістарыяграфіі можа даць спрыяльную магчымасць для адбудовы унікальнай сістэмы ведаў аб гісторыі вайны ў Беларусі ў 1941–1944 гг. Выкарыстанне якраз такога метаду дазволіць узбагаціць цэлы комплекс навуковай праблематыкі, якая ахоплівае: 1) планы нацысцкага кіраўніцтва па заваёве «жыццёвай прасторы на ўсходзе», у рамках якіх Беларусь разглядалася ў якасці самастойнага аб'екта злачыннага захопу тэрыторыі, прыродных і людскіх рэсурсаў, а таксама ў якасці палігону для ажыццяўлення нацысцкай расавай тэорыі і выканання генеральнага плана Ост; 2) унікальнасць рэгіянальнай сітуацыі, што склалася на тэрыторыі Беларусі з пачаткам аперацыі «Барбароса» і потым змянялася на працягу германскай акупацыі Беларусі ў 1941–1944 гг.; 3) рэальныя наступствы правядзення германскай эканамічнай палітыкі ў Беларусі: якія мэты ставілі перад сабой ваенныя, цывільныя і эканамічныя акупацыйныя структуры ў рамках татальнай эксплуатацыі сельскагаспадарчага, індустрыяльнага і людскога патэнцыялаў у Беларусі; 4) нацысцкую практыку правядзення генацыду ў Беларусі на прыкладах вынішчэння ваеннапалонных і мірнага насельніцтва, асабліва ў ходзе «канчатковага рашэння» яўрэйскага пытання і выканання дырэктыў па татальным вынішчэнні беларускай нацыі; 5) маштабы барацьбы масавага народнага супраціўлення на акупаванай тэрыторыі Беларусі, з аднаго боку, а з другога – гісторыю калабарацыянізму ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Праведзенае даследаванне дазваляе сучаснай нацыянальнай гістарыяграфіі не толькі паглыбіць веды ў дачыненні да акрэсленай праблематыкі, але і стварае падставы для навуковай праверкі супярэчлівых, нават узаемавыключальных гістарычных фактаў, садзейнічае актыўнаму ўзбагачэнню ведаў па ваеннай гісторыі беларускага народа [44, с. 23].

Вынікам праведзенага даследавання становіцца асэнсаванне ў айчыннай літаратуры поглядаў нямецкіх аўтараў на з'явы, падзеі і факты другой сусветнай вайны, а таксама іх параўнанне з ацэнкамі і высновамі беларускіх гісторыкаў. У лік новых навуковых задач вылучаюцца: *па-першае,* вывучэнне стану, метадалагічных асноў і асаблівасцей асвятлення ў айчыннай гістарыяграфіі пытанняў гісторыі Беларусі ваеннага перыяду, адлюстраваных у германскіх даследаваннях па гісторыі другой сусветнай вайны; *па-другое,* аналіз вынікаў і ацэнка ступені вывучанасці беларускай праблематыкі ў працах нямецкіх даследчыкаў, дзякуючы якім у замежнай гістарыяграфіі ўзнік самастойны навуковы напрамак – германская ваенная беларусістыка; *па-трэцяе,* выяўленне навукова абгрунтаваных высноў, якія пасля праведзенага аналізу поглядаў і падыходаў беларускіх і нямецкіх аўтараў будуць садзейнічаць аднаўленню гістарычнай праўды ў дачыненні да супярэчлівых праблем ваеннай гісторыі Беларусі; *па-чацвёртае,* вызначэнне базавых канцэптуальных падыходаў і гістарыяграфічных тэндэнцый, якія збліжаюць погляды айчынных і замежных даследчыкаў па асноўных праблемах ваеннай гісторыі і гісторыі вайны, гісторыі паўсядзённасці; *па-пятае,* выяўленне тэндэнцыйных падыходаў і стэрэатыпных ацэнак, якія не адпавядаюць гістарычнай рэчаіснасці і аказаліся навукова абвергнутымі ў ходзе аналізу розных, у тым ліку супярэчлівых гістарыяграфічных фактаў; *па-шостае,* высвятленне перспектыў для распрацоўкі пастаўленай вышэй праблематыкі з улікам назапашаных новых гістарычных і гістарыяграфічных ведаў; *па-сёмае,* правядзенне на аснове выкарыстання метаду гістарыяграфічнай кампаратывістыкі адэкватнага навуковага даследавання па гісторыі беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг.

Аналіз існуючых у беларускай і германскай гістарыяграфіі поглядаў сведчыць, што гістарычная навука абедзвюх краін стварыла трывалую базу для выкарыстання адэкватных навуковых падыходаў у аспекце паглыблення ведаў аб айчыннай ваеннай гісторыі. Як вынікае з матэрыялу артыкула, правядзенне параўнальна-гістарычнага даследавання гісторыі Беларусі ў кантэксце другой сусветнай вайны цяпер практычна немагчыма без звароту да метаду *гістарыяграфічнай кампаратывістыкі.*

## Літаратура

1. С и д о р ц о в, В. Н. Народ во второй мировой и Великой Отечественной войне: синергетический взгляд на историю: Научное издание / В. Н. Сидорцов, В. А. Латышева. – СПб.: Образование – Культура, 2005. – 144 с.

2. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: Энцыкл. / Бел. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1990. – 680 с.

3. Беларусь в годы Великой Отечественной войны: уроки истории и современность: материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 29–30 июня 2004 г.) / НАН Беларуси; Ин-т истории НАН Беларуси; редкол.: А. М. Литвин [и др.]. – Минск, 2004. – 262 с.

4. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А. А. Коваленя (руководитель авторского коллектива) [и др.]; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск: БЕЛТА, 2005. – 544 с.: ил.

5. Великая Победа: героизм и подвиг народов: материалы Междунар. науч. конф. (Минск, 28–29 апреля 2005 г.): в 2 т. / НАН Беларуси; Ин-т истории НАН Беларуси; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2006. – Т. 1 / Отв. ред. А. М. Литвин. – 2006. – 226 с.; Т. 2 / Отв. ред. А. М. Литвин. – 2006. – 216 с.

6. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства: збор. арт. / НАН Беларусі; Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: Я. С. Паўлаў (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 1999. – 253 с.

7. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: стан і перспектывы даследавання праблемы: матэрыялы «круглага стала» (Мінск, 22 лістапада 2002 г.) / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А. А Каваленя, А. М. Літвін (адк. рэд.) і інш. – Мінск: ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі», 2005. – 202 с.

8. К а з л о в а, С. Л. Аграрная акупацыйная палітыка на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1941–1944) у польскай і нямецкай гістарыяграфіях / С. Л. Казлова // Беларусь в годы Великой Отечественной войны: уроки истории и современность: материалы Междунар. науч. конф., посвящ. 60-й годовщине освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков (Минск, 29–30 июня 2004 г.) / НАН Беларуси; Ин-т истории НАН Беларуси; сост. Н. С. Сташкевич [и др.]. – Минск, 2004. – С. 209–213.

9. К а л а т к о ў, У. Я. Гістарыяграфія ФРГ 1950–1980-х гадоў пра нацысцкую культурную палітыку ў акупаванай Беларусі (да пастаноўкі праблемы) / У. Я. Калаткоў // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 16 мая 2003 г., вып. 2 / Мінскі дзярж. лінгв. ун-т; А. А. Каваленя (гал. рэд.). – Мінск, 2003. – С. 88–92.

10. К а л а т к о ў, У. Я. Нацысцкая акупацыйная палітыка ў сацыяльна-культурнай сферы на тэрыторыі Беларусі: кароткі агляд германскай гістарыяграфіі / У. Я. Калаткоў // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 13 мая 2005 г., вып. 4 / Мінскі дзярж. лінгв. ун-т; А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 165–168.

11. Н о в і к а ў, С. Я. Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі другой сусветнай вайны / С. Я. Новікаў. – Мінск: МДЛУ, 2004. – 223 с.

12. К а в а л е н я, А. А. Некаторыя метадалагічныя падыходы ў даследаванні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны / А. А. Каваленя // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: стан і перспектывы даследавання праблемы: матэрыялы «круглага стала» (Мінск, 22 лістапада 2002 г.) / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А. А Каваленя, А. М. Літвін (адк. рэд.) і інш. – Мінск: ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі», 2005. – С. 18–26.

13. Л і т в і н, А. М. Сучасная гістарыяграфія ваеннай гісторыі Беларусі перыяду другой сусветнай вайны: асаблівасці навуковага вывучэння // А. М. Літвін // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы навук. канф., Мінск, 23 мая 2002 г. / Мінскі дзярж. лінгв. ун-т; У. Ф. Ладысеў (гал. рэд.). – Мінск, 2003. – С. 106–115.

14. Л і т в і н, А. М. Беларусь у гады другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў: стан гістарыяграфіі і перспектывы далейшага даследавання праблемы / А. М. Літвін // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: стан і перспектывы даследавання праблемы: матэрыялы «круглага стала» (Мінск, 22 лістапада 2002 г.) / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А. А Каваленя, А. М. Літвін (адк. рэд.) і інш. – Мінск: ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі», 2005. – С. 6–18.

15. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: в 3 т. / редкол.: А. Т. Кузьмин [и др.]. – Минск: Беларусь, 1983 – 1985. – Т. 1. – 1983. – 591 с.; – Т. 2. – 1984. – 551 с.; – Т. 3. – 1985. – 531 с.

16. Ж у к, Н. П. Партизанское движение Белоруссии периода Великой Отечественной войны в отражении западногерманской буржуазной историографии: дис. … канд. ист. иаук: 07.00.02 / Н. П. Жук. – Минск, 1990. – 198 л.

17. Р а м а н о ў с к і, В. Ф. Супраць фальсіфікацыі гісторыі савецкага партызанскага руху / В. Ф. Раманоўскі. – Мінск: Дзяржвыд. БССР, 1962. – 90 с.

18. Р о м а н о в с к и й, В. Ф. Против фальсификации истории Белоруссии периода Великой Отечественной войны / В. Ф. Романовский. – Минск: Наука и техника, 1975. – 128 с.

19. Р о м а н о в с к и й, В. Ф. Правда истории против фальсификации / В. Ф. Романовский; под ред. А. Н. Мацко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 72 с.

20. Г е р м а н, К. К. Правда истории против лжи о войне: Критика буржуаз. фальсификаций истории второй мировой войны и Великой Отечественной войны Сов. Союза: научно-попул. очерк. / К. К. Герман . – Минск: Университетское, 1986. – 235 с.

21. M ü l l e r, R.-D. Hitlers Krieg im Osten 1941–1945: Ein Forschungsbericht / R.-D. Müller, G. R. Ueberschär. – Darmstadt: Wissenschaftliche Buchgesellschaft, 2000. – 451 s.

22. L e n h a r d, H. «Lebensraum im Osten». Deutsche in Belorußland 1941–1944 / H. Lenhard. – Düsseldorf: IBB, 1991. – 312 s.

23. C h i a r i, B. Alltag hinter der Front. Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weißrußland 1941–1944 / B. Chiari. – Düsseldorf: Droste, 1998. – 380 s.

24. G e r l a c h, Ch. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941 bis 1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg: Hambuger Edition, 1999. – 1232 s.

25. K o h l, P. Das Vernichtungslager Trostenez. Augenzeugenberichte und Dokumente / P. Kohl. – Dortmund: IBB, 2003. – 112 s.

26. Sowjetische Partisanen in Weißrußland. Innenansichten aus dem Gebiet Baranovici 1941–1944: Eine Dokumentation / hrsg. und eingel. von Bogdan Musial. – München: R. Oldenbourg Verlag, 2004. – 271 s.

27. G u r i l l a, W. Die deutsche Ordnungspolizei und der Holocaust im Baltikum und in Weißrußland 1941–1944 / W. Gurilla. – Paderborn; München; Wien; Zürich: Verdinand Schöningh, 2006. – 1041 s.

28. B r a k e l, A. Baranowicze 1939 – 1949. Eine Region der *kresy wschodnie* unter sowjetischer und deutscher Besatzung. Inauguraldissertation zur Erlangung des Akademischen Grades / A. Brakel. – Mainz, 2006. – 453 s.

29. A r n o l d, K. J. Die Wehrmacht und die Besatzungspolitik in den besetzten Gebieten der Sowjetunion. Kriegführung und Radikalisierung im „Unternehmen Barbarossa» / K. J. Arnold. – Berlin: Dunker&Humbolt, 2005. – 579 s.

30. Verbrechen der Wehrmacht. Dimensionen des Vernichtungskrieges 1941–1944 / hrsg. v. Hamburger Institut für Sozialforschung. – Hamburg: Hamburger Edition, 2002. – 748 s.

31. Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg: Die deutsche Kriegsgesellschaft 1939 bis 1945: Bd. 9/1, 9/2 / hrsg. vom Militär- geschichtlichen Forschungsamt München: Deutsche Verlags-Anstalt, 2004–2005. – Bd. 9/1. – 2004.– 993 s.; – Bd. 9/2. – 2005. – 1112 s.

32. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце другой сусветнай вайны): Вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйш. адукацыі / А. А. Каваленя [і інш.]; пад рэд. А. А. Кавалені, М. С. Сташкевіча. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2004. – 279 с.

33. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце другой сусветнай вайны): Вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі / А. А. Каваленя [і інш.]; пад рэд. А. А. Кавалені, М. С. Сташкевіча. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2004. – 231 с.

34. Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны: Вучэб. дапаможнік / А. А. Каваленя [і інш.]; пад рэд. А. А. Кавалені. – Мінск: Акадэмія МУС Рэсп. Беларусь, 2004. – 124 с.

35. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце другой сусветнай вайны): Вучэбны дапаможнік / В. Ф. Голубеў [і інш.]; рэдкал:. Ю. М. Бохан [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2005. – 279 с.

36. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 4: Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945). – 1975. – 775 с.

37. Экономика Советской Белоруссии 1917–1967 / редкол.: Ф. С. Мартинкевич [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1967. – 542 с.

38. Стенограмма совещания высшего руководства Генерального округа «Белоруссия» (Минск, 8–10 апреля 1943 года) / авторы-сост. С. В. Жумарь, С. Е. Новиков, Р. А. Черноглазова. – Минск: МДЛУ, 2006. – 220 с.

39. Белорусские остарбайтеры: ист.-аналит. исслед. / Г. Д. Кнатько, В. И. Адамушко, Н. А. Бондаренко, В. Д. Селеменев; под общ. ред. Г. Д. Кнатько. – Минск: НАРБ, 2001. – 336 с.

40. Н о в і к а ў, С. Я. Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941–1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў / С. Я. Новікаў. – Мінск: МДЛУ, 2002. – 219 с.

41. Э м а р, М. История и компаративизм // Европейский опыт и преподавание истории в постсоветской России / М. Эмар. – М.: ИВИ РАН, 1999. – С. 70–82.

42. Методологические проблемы истории: учеб. пособие для студентов, магистрантов и аспирантов ист. и филос. специальностей, обеспечивающих получение высшего образования / В. Н. Сидорцов [и др.]; под. общ. ред. В. Н. Сидорцова. – Минск: ТетраСистемс, 2006. – 352 с.

43. Р у м я н ц е в а, М. Ф. Теория истории: Учебное пособие / М. Ф. Румянцева. – М.: Аспект Пресс, 2002. – 319 с.

44. Гісторыя Беларусі: У 6 т. – Т. 5. – Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэдактар) і інш. – Мінск, 2006. – 613 с.

*S. Ya. NOVIKAW*

**THE MILITARY HISTORY OF BELARUS OF 1941–1945 YEARS IN THE CONTEXT OF THE HISTORIOGRAPHIC COMPARTIVISTICS**

## Summary

The article devoted to the relevant research problem which is the determination by the historical comparative method for the system analysis of the military Belarusian history in context of the World II War in the modern Belarusian historiography.